Свобода. Возможность. Успех!
ТРЕТИЙ ПУТЬ
интернет-сообщество

Пакаленне Адраджэння
A Generation of Renaissance

KULTUR AKTIV

Паважаныя сябры!

Інтэрнэт-супольнасць “Трэці Шлях” і нямецкая арганізацыя “Культур Актыў” рады запрасіць вас на дыскусію “**Эканамічная сітуацыя ў Беларусі ў новых умовах”**, якая адбудзецца **17.02.2008** у Менску ў Міжнародным адукацыйным цэнтры.

Вядома, што 2008 год будзе вельмі важным для беларускай эканомікі. Згодна з дамовай аб пастаўках газа з кампаніяй “Газпром” кошты на расейскі газ у гэтым годзе могуць скласці да 67% ад еўрапейскіх, што прывядзе да цяжкіх наступстваў у эканоміцы і падзеняя рэнтабільнасці вытворчасці. Адпаведна адбудуцца змены эканамічных паказчыкаў і падзенне агульнага жыццёвага ўзроўню, а таксама рост інфляцыі і беспрацоўе. У дадзенай сітуацыі паўстае пытанне аб правядзенні праграмы па прыватызацыі дзяржаўнага сектара і ўвядзенні інвестыцый. Працэс закрытай прыватызацыі ўжо пачаўся, што мы назіралі на прыкладзе сакрэтных перамоў аб продажы кантрольнага пакета акцый кампаніі “Velcom” і “Мотавелазавода”.

Ці будзе далейшы працэс прыватызацыі адбывацца такім жа чынам? Ці можна казаць аб пачатку трансфармацыі беларускай эканомікі?

Аб эканамічным становішчы Беларусі ў новых умовах, тэндэнцыях развіцця і працэсе прыватызацыі распавядзе беларускі эксперт – прадстаўнік даследчага цэнтра “BISS” **Кірыл Гайдук.**

**Для ўдзелу ў мерапрыемстве неабходна запоўніць заяўку ўдзельніка і даслаць яе па адрасе liberalclub2008@gmail.com. Заяўкі будуць прымацца да 14.02.2008. Для ўдзельнікаў з рэгіёнаў праезд аплочваецца!**

**Час і месца правядзення:**
17.02.2008 (нядзеля), 10.00 – 16.00
Менск, Міжнародны адукацыйны цэнтр (IBB), праспект газеты “Праўда” 11

**За дадатковай інфармацыяй звяртайцеся па тэлефонах: 7228771(МТС) – Ульяна, 2552362 (МТС) – Алесь.**